*Pieczątka szkoły*

| *Kod ucznia* | *Liczba punktów* |
|---|---|
| | |

**WOJEWÓDZKI KONKURS JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO**

**DLA UCZNIÓW SZKÓŁ PODSTAWOWYCH**

**W ROKU SZKOLNYM 2016/2017**

***STOPIEŃ WOJEWÓDZKI – 24.02.2017 r.***

1. Test konkursowy zawiera 10 zadań. Są to zadania zamknięte i otwarte. Na ich rozwiązanie masz 90 minut. Sprawdź, czy test jest kompletny.
2. Zanim udzielisz odpowiedzi, uważnie przeczytaj treść zadania.
3. Wszystkie odpowiedzi czytelnie i wyraźnie wpisuj w wyznaczonych miejscach.
4. Test wypełniaj długopisem, nie używaj korektora, ołówka ani gumki. Nie komunikuj się z innymi uczestnikami konkursu.
5. Przy rozwiązywaniu zadań zamkniętych wyboru wielokrotnego wybierz jedną, prawidłową odpowiedź i zaznacz ją krzyżykiem, np.:

   A̶ B C D

   Jeżeli się pomylisz i zechcesz wybrać inną odpowiedź, to złe zaznaczenie otocz kółkiem (B̶) , po czym skreśl właściwą literę, np.:

   A (B̶) C̶ D

6. Sprawdź wszystkie odpowiedzi przed oddaniem testu.

7. Nie podpisuj testu, zostanie on zakodowany.

8. Brudnopis, dołączony do testu, nie podlega ocenie.

**Zadanie 1.** *(p. 6)*

Неўзабаве дзень нараджэння тваёй мамы. Напішы ёй пажаданні з гэтай нагоды (мінімум тры сказы). Мусяць там выступіць такія элементы, як: каму жадаеш?; чаго?; з якой нагоды?; хто складае пажаданні?.

…………………………………………………………………………………………
…………………………………………………………………………………………
………………………………………………………………………………………….
…………………………………………………………………………………………

**Zadanie 2.** *(p. 10)*

Дапоўні тэкст дзеясловамі, якія выступілі ў тэксце Уладзіміра Арлова "Рагвалод і Рагнеда”.

Спачатку ў Полацк ........................... сваты з Кіева. Рагвалод паразважаў і ......................................, што выгаднейшым будзе саюз з кіеўскім князем Яраполкам. І тут у Полацк нечакана ................................... сваты з Ноўгарада. Князь Рагвалод ............................... дачку і перад гасцямі ..................................., ці хоча яна ........................... за Уладзіміра. Ганарлівая Рагнеда .......................... ды яшчэ і .........................., што Уладзімір - сын рабыні, а такі жаніх ёй не трэба. Даведаўшыся пра гэта Уладзімір страшэнна ................................ і з вялікім войскам .......................... на Полацк.

Словы: рушыў, угневаўся, запытаўся, дадала, з'явіліся, прыехалі, адмовілася, паклікаў, вырашыў, пайсці.

**Zadanie 3.** *(p. 10)*

На аснове верша Артура Вольскага і іншых крыніц раскажы прынамсі ў пяці сказах пра старажытны беларускі герб.

„Пагоня”

А чые там
дзіва-коні
абганяюць час?

Гэта едзе ў ззянні-звоне
сонейка да нас.

Конь чырвоны пасяродку.
Белыя - з бакоў
Скачуць хутка.
Скачуць ходка.
Іскры з-пад падкоў.

Рыцар побач з імі ў гонцы.
Меч, як звон, звініць
Ён ад хмараў
наша сонца
будзе бараніць.

У пагоні
скачуць коні
у світальны час.
Гэта едзе ў ззянні-звоне
сонейка да нас.

.......................................................................................................................................
.......................................................................................................................................
.......................................................................................................................................
.......................................................................................................................................
.......................................................................................................................................
.......................................................................................................................................
.......................................................................................................................................

**Zadanie 4.** *(p. 6)*

Прачытай верш Алеся Барскага і адкажы на пытанні і заданні поўнымі сказамі.

„Белавежская зіма"

Эх, зіма белавежская, белая!
Па краіне рассыпаўся снег.
Толькі дрэвы стаяць акалелыя
І сумуюць аб цёплай вясне.

Эх, зіма белавежская, шчырая!
Напаўняе далін берагі.
Завіруха дыхнула ў шыры,
Лёг абрус на палі і лугі.

Не паспелі дубы аднаногія
Скінуць лісточкі з кароны
У шуме дрыжачай трывогі,
Заціснулі снег у далонях.

Эх, зіма белавежская, грозная!
Снег елкі па рукі засыпаў.
Бураломам прайшлася марозным
З акордамі воўкавых скрыпак.

1) Які настрой выклікае ў цябе верш і чаму? Абгрунтуй свой адказ.

………………………………………………………………………………………………
………………………………………………………………………………………………

2) Назаві два эпітэты, якімі акрэсліваецца белавежскую зіму.

………………………………………………………………………………………………
………………………………………………………………………………………………

3) Выпішы з тэксту дзве метафары.

………………………………………………………………………………………………
………………………………………………………………………………………………

**Zadanie 5.** *(p. 9)*

Займеннікі, што ў дужках запішы ў патрэбным склоне.

Мы расчынілі (вы) ................. дзверы гасцінна.

Забыць (ты) ................ не маю сілы.

К (ты) ............ я ў думках залятаю і там душою спачываю.

Вазоны стаялі на вокнах і каля (яны) ............ .

Віншую я (ты) ............. мой край.

І (я) ............. самому даўно хацелася пабачыцца і пагаварыць з (вы) ..................

Гэта хата не (ён) ....................

Голас у (яна) ................ быў мяккі, пявучы, добры.

**Zadanie 6.** *(p. 12)*

Дапішы прапушчаныя формы дзеясловаў будучага часу.

| | напісаць | прыйсці | падскочыць |
|---|---|---|---|
| я | напішу | .................. | ................ |
| ты | ............... | прыйдзеш | ............... |
| ён | ................ | ................. | падскочыць |
| мы | напішам | ................. | ..................... |
| вы | ............... | прыйдзеце | ..................... |
| яны | ............... | .................. | падскочаць |

**Zadanie 7.** *(p. 9)*

Дзеясловы, што ў дужках, пастаў у патрэбнай форме цяперашняга часу.

Я са Сцяпанам (уваходзіць) ......................... у дуброву. Ён доўга не (затрымлівацца) .............................. пад дубамі, (ісці) ........................... далей, бо даўно з імі звыкся. А я (нерухомець) ............................ і (адчуваць) ......................... , што вось ляснік (расхінуць) ................................ за дубамі дзверы ў галоўную залу сабора. І сапраўды (расхінацца) ................................ прастора. Ад вышыні (кружыцца) ................................ галава. (Чараваць) .......................... цішыня і чысціня. Такое можна сустрэць толькі ў прыродзе, дзе мастацкі геній працаваў не адну бяссонную ноч.

**Zadanie 8.** *(p. 4)*

Пастаў назоўнікі, што ў дужках, у патрэбнай форме.

Алесь даўно займаецца (спорт) ................................ .

Мой сябар цікавіцца (музыка) .................................. .

Мне падабаюцца песні гэтага (кампазітар) ...................... .

Парыж - сталіца (Францыя) ............................

**Zadanie 9.** *(p. 4)*

Складзі па адным сказе з кожным займеннікам: вы, яно.

.........................................................................................................................

.........................................................................................................................

**Zadanie 10.** *(p. 5)*

Перакладзі з беларускай мовы на польскую:

На стале, на льняным абрусе ляжыць свежанькі хлеб. Верхняя скарынка ў ім залацістая. Ніжняя – белая, відаць на ёй муку. Пякуць яго з жытняй мукі, перасеянай праз сіта. Ніколі ў жыцці не еў я хлеба смачнейшага ад таго, які пячэ бабуля.

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

**BRUDNOPIS (nie jest oceniany)**